общества в сфере стабилизации семейной политики, обладает высоким воспитательным потенциалом.


1. *Абдыкаликова, Г.* Семья – созидательная сила «Мәңгілік Ел» / Г. Абдыкаликова // Казахстанская правда. – 2016. – 8 сент.

2. *Выжигина, М. В.* Семейные праздники в музее / М. В. Выжигина // Музей, школа, семья : тр. ГМИ. – Санкт-Петербург : ГМИ СПб, 2005. – Вып. 11. – С. 97-101.

3. *Макеева, И. А.* Музей в системе социального воспитания / И. А. Макеева // Молодой ученый. – 2011. – № 1. – С. 211-214.

4. *Сидорова, О. В.* Семейная аудитория как объект музейно-педагогической деятельности / О. В. Сидорова // Материалы второй межрегион. науч.-практ. конф., ISIS, апр. 2011 г. – Новосибирск : Новосиб. изд. дом, 2011. – С. 300-306.

5. *В музей* – так всей семьей! [Электронный ресурс] / Комсомольская правда. Казахстан. – Режим доступа: http://www.kp.kz/11887-v-muzey-tak-vsey-semey. – Дата доступа: 13.06.2019.



***Мазалеўскі Вячаслаў Іванавіч***


## Сацыякультурная дзейнасць музея па маральным выхаванні падлетка


У артыкуле раскрываецца значэнне сацыякультурнай дзейнасці музея па маральным выхаванні падлетка. Асвятляецца гісторыя пераходу ад маналагічнага ўздзеяння на аўдыторыю да дыялогу паміж музеем і падлеткам. Разглядаецца праблема маральнага выхавання дзяцей старэйшага школьнага ўзросту сродкамі музейнай педагогікі. Адным з варыянтаў якой бачыцца рэалізацыя комплекснага выкарыстання культура-стваральнага патэнцыялу сучаснага музея.



*Ключавыя словы:* маральнае выхаванне; падлетак; музей; музейная педагогіка; сацыякультурная дзейнасць.



***Viachaslau I. Mazaleuski***


## Teenagers' Ethical Education in Socio-cultural Museum Activity


The article reveals the importance of museum socio-cultural activities regarding the ethical education of the teenagers. The history of the transition from the education of the audience through a monologue to a dialogue between the museum and the teenager is covered. The issue of ethical education of high school age children thru pedagogical museum means is considered. One of the optionsis the realization of a complex application of the modern museum's cultural potential.



*Keywords:* ethical education; teenager; museum; museum pedagogy; socio-cultural activities.


У апошнія гады педагагічная супольнасць сутыкнулася з рэзкім падзеннем культуры сярод дзяцей старэйшага школьнага ўзросту. Многія даследчыкі адзначаюць з боку падлеткаў устойлівае нежаданне засвойваць культурныя каштоўнасці, хоць гэтыя каштоўнасці шырока прадстаўлены грамадствам: тэатры, музеі, бібліятэкі, канцэртныя залы і г. д. [1, с. 62].

Рэчаіснасць дыктуе неабходнасць пошуку новых падыходаў да асэнсавання галоўных праблем культуры і адукацыі, у аснове якой ляжыць маральная творчасць моладзі. Вывучэнне ўзаемасувязі падлетка і культуры ажыццяўляецца з прыцягненнем вопыту розных дысцыплін. Змены, якія адбываюцца ў сферы культуры і навукі, прывялі да пераасэнсавання адукацыі як сацыякультурнага феномену. У наш час стаў актуальным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не столькі рацыянальны, колькі культураадпаведны падыход да адукацыі, які прадугледжвае стварэнне ўмоў для творчага маральнага самавызначэння асобы [2, с. 53]. Зварот да каштоўнасцяў, што захоўваюцца чалавецтвам у сусветнай культуры, прадугледжвае ўключэнне асобы дзіцяці старэйшага школьнага ўзросту ў гісторыка-культурную прастору, якая стварае глебу для ўсведамлення ім сябе як суб'екта культуры.

Асаблівая роля ў вырашэнні гэтай задачы належыць музею, які выводзіць падлетка за межы соцыуму, цывілізацыі ў свет культуры. У гэтай сувязі для адукацыі ўяўляюць цікавасць сацыякультурныя функцыі музея. Музей – гэта, фактычна, інстытут, які склаўся гістарычна. Яго функцыя заключаецца ў захаванні ў сапраўдных матэрыяльных прадметах розных карцін свету і спосабаў пазнання быцця.

У сучасных гуманітарных ведах сацыякультурная дзейнасць музея разумеецца як важны кампанент музейнай камунікацыі і адзін з вядучых напрамкаў музейнай працы, у якім рэалізуецца адукацыйна-выхаваўчая функцыя музея. Тэарэтычную аснову сацыякультурнай дзейнасці складае музейная педагогіка, псіхалогія мастацтва, культуралогія.

Музей, які існаваў як дзяржаўная ўстанова аўтаномна і самадастаткова, выконваў класічныя ахоўна-трансляцыйныя, асветніцкія, забаўляльныя, рэлаксацыйныя функцыі, зараз становіцца ў поўнай меры адукацыйнай установай, якая фарміруе ўласныя праграмы, арыентаваныя на розныя тыпы аўдыторыі [3, с. 69].

Навукоўцы адзначаюць, што традыцыйна музей з яго экспазіцыямі ўяўляў «культурны тэкст», які патрабуе адпаведнага чытання. На развіццё музеязнаўства аказала ўплыў тэорыя дыялагізму М. М. Бахціна, згодна з якой на змену старому тыпу маналагічнай культуры ідзе новы – дыялагічны [4, с. 38-39]. У гэтай сацыякультурнай сітуацыі музей закліканы быў стаць месцам культурна-гістарычнага дыялогу, знайсці новыя формы зносін наведвальніка з культурнымі каштоўнасцямі. Сёння музей прад'яўляе наведвальніку падзею, рэалізуе акт уваходжання ў сімвалічную, фіктыўную, міфалагізаваную рэальнасць.

Сучасны музей здзяйсняе пераход ад слова да падзеі, ператвараючы гледача ў дзеючую асобу. Іншымі словамі, менавіта ў музеі здзяйсняецца адукацыйнае дзеянне, адбываецца збліжэнне функцыі раней раз'яднаных кампанентаў культуры: музей становіцца тэатрам, бібліятэкай і, што асабліва важна, школай.

Беларускія музеі актывізавалі працу з дзецьмі, сталі ствараць для іх экскурсіі і культурна-адукацыйныя праграмы. Сучасная музейная педагогіка развіваецца ў рэчышчы праблем музейнай камунікацыі і накіравана, у першую чаргу, на рашэнне задач актывізацыі творчых здольнасцяў асобы падлетка. Таму ствараюцца розныя методыкі працы з наведвальнікамі, змяняецца іх роля і пазіцыя ў музейна-педагагічным працэсе.

Нягледзячы на зацвярджэнне ідэй дыферэнцыраванага падыходу да розных катэгорый наведвальнікаў, асноўная ўвага музейнай педагогікі па-ранейшаму засяроджана на дзіцячай і падлеткавай аўдыторыі. У аснову сучаснай музейнай педагогікі пакладзены ідэі асэнсавання існавання свету і індывідуальнага жыцця дзяцей, яна ў сваім аспекце вырашае пытанне, якім быць падлетку ў свеце, які ўвесь час мяняецца [5, с. 39]. Педагагічная мэта працы любога музея, што супрацоўнічае са школай, – фарміраванне эмацыйна-асобасных адносін дзіцяці да каштоўнасцяў культурнай спадчыны ў сістэме маральнага выхавання.

Асноўныя прынцыпы музейнай педагогікі: цесная арганічная сувязь культуры і адукацыі; высокі ўзровень інтэграцыі музея і школы; улік узроставых і індывідуальных асаблівасцяў дзяцей, іх інтарэсаў і схільнасцей; комплекснасць у вывучэнні відаў мастацтваў; асобасна арыентаваны характар дзейнасці; гуманістычная накіраванасць; педагагічная мэтазгоднасць. Рэалізацыя гэтых прынцыпаў пры вырашэнні складаных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задач комплекснага мастацкага выхавання і развіцця асобы дзіцяці старэйшага школьнага ўзросту, а таксама фарміраванне маральных каштоўнасцяў падрастаючага пакалення сродкамі музейнай педагогікі могуць быць прадстаўлены ў розных відах супрацоўніцтва музея і школы.

У цяперашні час вызначыліся чатыры напрамкі: школа пры музеі, школа ў адукацыйнай прасторы музея, школьны музей, музей у адукацыйнай прасторы школы.

У. М. Грусман, вывучаючы станаўленне і развіццё сацыякультурных функцый музеяў, да традыцыйных функцый захавання і экспаніравання лічыў неабходным дадаць адукацыйна-развівальную і забаўляльна-пазнавальную функцыі музея. Іх інтэграцыя дазваляе разглядаць яго не толькі як засяроджванне каштоўнасцяў гісторыі і культуры, але і як цэнтр маральнага жыцця, якое забяспечвае комплекснае выкарыстанне культура-стваральнага патэнцыялу айчынных музеяў [5]. У. М. Грусман адзначаў, што функцыі развівальнага пазнання спрыяюць пераўтварэнню аб'екта музейнага ўздзеяння (маецца на ўвазе падлетак) у суб'ект сацыякультурнай творчасці.

Аналізуючы вышэйсказанае, можна прыйсці да высновы, што ў музейнай дзейнасці маналагічнае ўздзеянне музея на аўдыторыю саступае месца дыялогу паміж музеем, падлеткам і знешнім асяроддзем, і ў гэты дыялог уключаюцца не толькі рэаліі сучаснага жыцця, але і погляды, меркаванні іншых гістарычных эпох. У працэсе дыялогу паміж музеем і моладдзю сутыкаюцца розныя канцэпцыі, удзельнікі яго валодаюць асаблівым поглядам на доследныя праблемы. Сукупнасць гэтых поглядаў вызначае спецыфічны асяродак музейнай прасторы.

Б. А. Сталяроў сцвярджае, што сутнасць музея не ў перадачы ведаў, паколькі музейная педагогіка не можа будавацца як чыстая дыдактыка. Гаворка павінна ісці аб катэгорыі каштоўнаснай свядомасці, драматургіі і культурна-гістарычнага дыялогу, якія разгортваюцца ў музеі. У музеі адукацыя ажыццяўляецца праз каштоўнаснае стаўленне асобы дзіцяці старэйшага школьнага ўзросту і пашырэнне пачуццёвага вопыту ў працэсе зносін з помнікам культуры [6].

Галоўны аспект у сучаснай педагогіцы зроблены на візуальным і прасторавым характары музейнай камунікацыі, які прадстаўляе сабой не што іншае, як працэс зносін падлетка, які выступае ў ролі наведвальніка з музейнымі экспанатамі, якія прадстаўляюць сабой «рэальныя рэчы». У аснове гэтых зносін ляжыць, з аднаго боку, здольнасць падлетка разумець «мову рэчаў», з другога – здольнасць музейных спецыялістаў будаваць асаблівыя невербальныя «прасторавыя выказванні».

У заключэнне варта сказаць, што музей як сімвал культуры і як адукацыйная ўстанова прызваны адыграць важную ролю ў фарміраванні цэласнай асобы дзіцяці старэйшага школьнага ўзросту, развіцці яго агульнакультурнай кампетэнтнасці, выхаванні маральных якасцяў.


1. *Белянкова, Н. М.* Возможности музейной педагогики в организации исследовательской работы младших школьников / Н. М. Белянкова // Начальная школа. – 2011. – № 9. – С. 62-64.

2. *Васичева, Э. В.* Музейная педагогика в образовательном пространстве школы / Э. В. Васичева, Л. М. Иванова, Т. А. Соколова // Методист : науч.-метод. журн. – Москва : Методист, 2001. – С. 53-59.

3. *Комаровская, Е. П.* Культурно-образовательная деятельность музеев и музейная педагогика / Е. П. Комаровская, В. М. Ахунов // Вестник Московского университета. Сер. 20. Педагогическое образование. – 2009. – № 1. – С. 69-72.

4. *Ахунов, В. М.* Музейная педагогика как научная дисциплина: к истории становления / В. М. Ахунов // Вестник Московского университета. Сер. 20. Педагогическое образование. – 2008. – № 4. – С. 36-44.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Васильева, Т. Е.* Музейная педагогика как средство формирования духовно-нравственных ценностей / Т. Е. Васильева, О. Г. Панченко // Воспитание школьников. – 2011. – № 4. – С. 37-41.

6. *Столяров, Б. А.* Теория и практика образовательной деятельности художественного музея : автореф. дис. ... д-ра пед. наук: 13.00.01 / Б. А. Столяров; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – Санкт-Петербург, 1999. – 43 с.

***Мельник Мирослав Тарасович***

## Музеи моды: специфика и туристический потенциал

В статье раскрывается эволюция восприятия костюма, история становления музеев моды, выявляются особенности экспонирования модного костюма в музейном пространстве, анализируются различные форматы фэшн-выставок, подчеркивается важность музеев моды в качестве туристических аттракторов и мест культурно-образовательного и развлекательного туризма.

*Ключевые слова:* мода; музей моды; фэшн-выставка; экспонирование костюма; фэшн-туризм.

***Myroslav T. Melnik***

## Fashion Museums: the Specificity and Tourism Potential

The article reveals the evolution of the costume perception, traces the history of fashion museums, reveals the features of exhibiting the fashionable costume in the Museum space, analyzes various formats of fashion exhibitions, and emphasizes the importance of fashion museums as tourist attractions and places of cultural, educational and entertainment tourism.

*Keywords:* fashion; Fashion Museum; fashion exhibition; costume exhibition; fashion tourism.

*Актуальность исследования.* В начале XXI века мода заняла видное место в художественной культуре, однако ее место в искусстве до сих пор дискутируется. Произведения многих модельеров считаются произведениями искусства, выставки костюма стали привычными в пространствах музеев искусств, художественных галерей. Выставки костюма и моды пользуются популярностью и привлекают большое количество посетителей. Отдельные музеи костюма и моды появились во многих туристических центрах по всему миру, они, наряду с другими культурными достопримечательностями, привлекают значительное количество туристов, улучшают туристические имиджи городов и стран. В связи с этим актуально рассмотреть специфику музеев моды и проанализировать, какую роль они играют в развитии туризма.

*Задачи исследования* включают определение разницы между художественной выставкой, выставкой костюма и моды; выявление специфики функционирования модного объекта в выставочном пространстве; анализ способов построения фэшн-экспозиции, определение туристического потенциала музеев моды.

*Обзор предыдущих исследований.* Среди источников, посвященных изучаемой проблематике, книга «Мода и музеи: теория и практика» под редакцией Мари Мельхиор и Биргитты Свенсон [2]. В книге осмысливаются аналитические основы и способы репрезентации моды в музее. Музеелогию моды авторы ведут с начала XX века, исследуя причины популярности моды в музее и ее влияние на более широкую музейную практику. Также рассматривается, как мода сделала музеи привлекательными для различных аудиторий и как кураторы представляют более широкие темы и проблемы посредством экспонирования моды [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ